паслясловe

# Плён навукоўцаў

**Маштабная выстаўка, прымеркаваная да Дня беларускай навукі, прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Арганізатар — Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы.**

Навукова-даследчыя інстытуты і цэнтры, якія працуюць у складзе Нацыянальнай акадэміі навук, прадставілі ў НББ свае найлепшыя распрацоўкі, вынікі дзейнасці і праекты ў розных галінах: энергетыцы, металургіі, оптыка-механічнай, хімічнай, біялагічнай прамысловасці, вытворчасці ўгнаенняў, сферы аховы здароўя і вытворчасці медпрэпаратаў, прыродаахоўнай сферы.

Таксама дэманстраваліся аграпрамысловыя і інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі.

Нацыянальная бібліятэка прадставіла свае інтэрнэт-рэсурсы, створаныя з мэтай захавання звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне: анлайн-энцыклапедыю «Беларусь у асобах і падзеях», «Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне рэспублікі Беларусь» і іншыя рэсурсы. Анлайн-энцыклапедыя захоўвае звесткі пра вядомых людзей Беларусі, помнікі гісторыі і культуры, археалогіі і горадабудаўніцтва, творчыя калектывы і грамадскія арганізацыі.

Цікава было пазнаёміцца з маладымі навукоўцамі, якія імкнуцца зрабіць свой асабісты ўнёсак у тэхнічны прагрэс і развіццё краіны.

Прадстаўнікі ТАА «Пеленг» прадэманстравалі макет апарата для аэракасмічнай прамысловасці, які можа фатаграфаваць паверхню Зямлі, а здымкі, выкананыя з вышыні, змогуць паслужыць для эфектыўнай работы сельскай гаспадаркі, горадабудаўніцтва альбо абароны лясных масіваў ад пажараў.

Маладыя навукоўцы з Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў паведамілі пра стварэнне каталога прыродных крыніц з чыстай вадой, які захоўвае інфармацыю пра 1183 крыніцы ў розных рэгіёнах Беларусі, карты і фотаздымкі.

**Эла ДЗВІНСКАЯ**